# Весткі й Паведамленьні

*інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”*

**Viestki j Paviedamleńni**

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 7 (605)
Ліпень 2016 г.


# Купальле ў Нью-Ёрку

У суботу, 18 чэрвеня група беларусаў зь Нью-Ёрку і ваколіцаў адсьвяткавала традыцыйны абрад Купальля ў цудоўнай мясьціне на поўнач ад гораду, якая завецца Паўнд-Рыдж-Парк. У надзвычай прыгожым ляндшафце, сярод пакрытых лесам пагоркаў, знаходзяцца вадасховішчы, што даюць воду гораду праз складаную сыстэму вадаводаў, якія былі збудаваныя яшчэ ў XIX ст. У лясах водзяцца казулі, алені й нават чорныя мядзьведзі, ня лічачы розных драбнейшых жывёлаў.

Гаспадарчай падрыхтоўкай да Купальля займалася сп-ва Лены і Пётры Рыжых, яны амаль тыдзень прыкладалі намаганьні, каб сьвята адбылося. На пагорку, дзе ўжо шмат гадоў распальваецца купальскае вогнішча сабраўся ладны гурт купальшчыкаў, прыкладна, семдзесят чалавек дарослых і больш за дзесятак дзетак. Былі масквічы й украінцы. Пагорак сёлета ўжо быў замалы, але панавала сьвяточная і дабразычлівая атмасфэра. Пачалося сьвята з абраньня Купаліша і Купалінкі. Абрад праводзіўся пад кіраўніцтвам знаўцы этнаграфіі й фальклёру сп-ні Валянціны Якімовіч.

Спачатку былі абраныя Князь-Купаліш, сьціплы хлапчына Віталь, і Купалінка, зь бялюткімі касічкамі Яна. Яны распалілі абрадавае вогнішча. Купалінка павіншавала прысутных з Купальлем, з часам найбольшага роскіту прыроды, і пажадала прысутным здароўя і дабрабыту. Урачыстым рэхам прагучала “Жыве Беларусь!” і “Слава Ўкраіне – Героям слава!” Па лесе разьнеслася зазыўная песьня “Добры вечар доброым людзям, клічам вас на Купальле”. Пасьля карагоднай “Ой рана на Йвана”славілі сонца і Беларусь “Сонейка! Ляцелі гусі зь Белае Русі, Сонейка!”, гучалі “Купалінка”, якую ведалі ўсе, “Гарэла сасна, палала”, “А на гары царкоўка”, купальская песьня С. Сокалава-Воюша “Дзе Ку-

*закачэньне на бачыне 2*





# Чэрвеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

Чэрвеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”, што прайшоў 11-га чэрвеня, меў насычаны парадак дня. Напачатку старшыня “Пагоні” сп. Віталь Зайка прывітаў прысутных, коратка распавёў пра арганізацыю і зрабіў аб’яву пра маючае адбыцца Купальле.

Затым адбыўся канцэрт з удзелам гасьцёў-музыкаў, цымбалісткі Тацьцяны Кукель зь Менску і клярнэтыста і кіраўніка гурту “Літвакус” Зьмітра-Зісла Сьляповіча зь Нью-Ёрку.

Напачатку сп. Сьляповіч прадставіў Тацьцяну, сваю калянку і аднакашніцу па музычнай школе ў Менску, і распавёў пра спалучэньне беларусіх і гэбрайскіх музычных традыцыяў, пра фальклёрныя карані гэтае зьявы і пра нядаўнія праявы творчага супрацоўніцтва, прыкладам якога можа быць адмысловая беларуская клэзмэрская традыцыя і музычны фэст “Жыдовішча”, што быў створаны па ўзоры беларускага рок-фэсту “Басовішча” на Беласточчыне.

Тацьцяна Кукель зайграла кампазыцыю Жыновіча “Беларускае вясельле”. Затым прагучэлі некалькі кампазыцыяў па фальклёрных мэлёдыях, якія сабрала навукоўца Соф’я Магід у 1920-я гады ў Беларусі.

Сп. Сьляповіч распавёў пра свой гурт “Літвакус” і альбом “Паштоўка-картл”, які нядаўна быў найграны. Ён засьпяваў песьню пабеларуску “Хайка-жыдоўка”. Тацьцяна Кукель выканала на цымбалах сола для фартэпіяна кампазытара Астурыяса, каб паказаць, што цымбалы маюць досыць шырокі выканаўчы дыяпазон. Потым супольна са Зьмітром пад акампанэмэнт клярнэту яна выканала некалькі кампазыцыяў са збораў фалькклоёру, што быў сабраны Зьмітром ва ўласных дасьледчых паездках па Беларусі й Украіне. Напрыканцы канцэрту прагучэла папуры зь беларускіх народных мэлёдыяў – “Лявоніха”, “Юрачка”, “Перапёлачка”, “Бывайце здаровы”. Канцэрт быў з захапленьнем сустрэты прысутнымі.



У другой частцы сходу прайшоў сэмінар па працы й вучобе з сэрыі, што была запачаткаваная сёлета на сходзе “Пагоні” 14-га траўня. Першым перад прысутнімі пра свой выбар спэцыяльнасьці ў Амэрыцы, пра вучобу тут і працу выступіў фінансавы аналітык сп. Юры Іваноў, які працуе ў кампаніі “Мэрыл-Лінч”. Ён распавёў коратка пра сябе, свой досьвед і вучобу ў Беларусі і затым пра тое, як і чаму ён падаўся ў фінансавую сфэру тут, у Амэрыцы. Ён скончыў Унівэрсытэт Масачусэцу ў Амхэрсьце і падчас вучобы рабіў націск на практыку, на інтэрнатуры. Імкнуўся набраць як найболей, бо гэта неабходна для рэзюмэ. “Трэба моцна шукаць працу, трэба пісаць лісты, што называецца, стукацца ва ўсе дзьверы, не баяцца што задужа вядомыя назвы і высокія пазыцыі. І тады вам адчыняць”. Сп. Іваноў распавёў пра спэцыфіку сваёй працы, пра тое, што трэба “працаваць не на кампанію, але на мэнэджэра”. Прамоўца адказаў на шматлікія пытаньні прысутных.

Затым выступіў сп. Алесь Сокал, які вучыўся ў Ратгэрс-унівэрсытэце і атрымаў ступень мастэра па мэдыцыне, на пасаду мэдбрата (nursing). Ён распавёў пра сыстэму пераводу крэдытаў (пунктаў) навучаньня, і пра тое, што мэдсфэра дужа запатрабаваная – цяпер ёсьць дэфіцыт мільёну мэдпрацаўнікоў сярэдняга зьвяна. Цяпер можна атрымаць ступень бакаляўра навучаючыся праз сеціва (онлайн), а тады ўзяць клінічную праграму, якую можна прайсьці за два гады. Сп. Сокал адказаў на пытаньні і патлумачыў дэталі сваёй вузкай спэцыяльнасць, па якой пляную знайсьці працу.

Пасьля афіцыйнай часткі адбылася таварыская імпрэза зь віном і пачастункамі.

**Віталь ЗАЙКА**

## Купальле ў Нью-Ёрку

***заканчэньне з бачыны 1***

пала начавала”. Асабліва даспадобы прыйшоўся ўсім карагод “У Кузьмы на дварочку”. Затым былі традыцыйныя гульні: “Падушачка”, “Цяцерка”, “Баяры”, калі хлопцы звычайна бліжэй знаёміліся й сыходзіліся зь дзяўчатамі.

У гэты час, ужо калі стала цёмна, Князь-Купаліш зазяваўся, і нячысьцікі скралі Купалінку ў цёмны гушчар. Давялося Купалішу з ягонай дружынай выпраўляцца на пошукі. Калі вогнішча зьменшыла свой пыл-жар, Купалінку знайшлі, і жадаючыя мелі магчымасьць паскакаць праз агонь, што меў сымболіку ачышчэньня, збавеньня ад грахоў. Частка ўдзельнікаў сьвяткаваньня выправіліся таксама зарабіць ачышчэньне вадою ў адным з азёраў.

Тым часам зварыўся традыцыйны напой на шматлікіх травах (27, калі дакладна) – крупнік, які надаваў сілу, здароўе і вяртаў голас. Пачаставаўшыся купальскім напоем, прысутныя селі вакол дагараючага вогнішча. Нехта зморана заснуў, іншыя вялі размовы і сьпявалі купальскія ды іншыя беларускія песьні. Некалькі сваіх песень зайграў паэт і выканаўца Сяржук Сокалаў-Воюш. Сьпевы і размовы цягнуліся да сьвітаньня.


Падзяка ў арганізацыі Купальля і падтрымцы гэтай старадаўняй традыцыі далёка ад Бацькаўшчыны належыцца спву Лене і Пётру Рыжым і сп-ні Валянціне Якімовіч.

**Віталь ЗАЙКА**

# Новыя “Запісы БІНіМ”

## (№ 38. Нью-Ерк – Менск, 2016)

У Менску пабачыў сьвет новы нумар альманаху “Запісы БІНіМ”. Асноўная тэма нумару – “Памяць”. Яна надзвычай важная для эміграцыйнай культуры. Суродзічы на чужыне аб’ядноўваюцца на падставе агульнай памяці пра радзіму, ім важна пакінуць памяць па сабе для нашчадкаў, як на Захадзе, гэтак і ў мэтраполіі. Памяць увасабляецца ў ідэях, тэкстах, вобразах, помніках. Уласна, тэксты ня толькі гэтага выпуску альманаху аб’яднаныя ідэяй захаваньня памяці пра беларусаў на чужыне.










Менавіта сфэры “палітыкі памяці” эміграцыйнай супольнасьці прысьвечаны тэкст Натальлі Гардзіенкі “Могілкі як частка мэмарыяльнай культуры беларускай эміграцыі”, заснаваны на апрацоўцы зьвестак з мультымэдыйнай базы, зьмешчанай на адмысловым СД у дадатку да гэтага выпуску альманаху. Тут упершыню абагульнены плён некалькіх дзесяцігодзьдзяў працы розных асобаў па зьбіраньні зьвестак пра беларускія могілкі на Захадзе. У базе прадстаўленыя здымкі і апісаньні надмагільных помнікаў больш як 970 беларусаў у 13 краінах.

Захаваньню памяці пра падзеі, дзеячаў і нават цэлыя асяродкі спрыяе “Эпісталярны архіў Янкі Запрудніка”. На падставе гэтага ліставаньня Лявон Юрэвіч аднаўляе цікавыя старонкі гісторыі й “нутранай кухні” беларускіх рэдакцый Радыё “Вызваленьне / Свабода” ды Гішпанскага радыё ў Мадрыдзе. А зь лістоў Эміля Цяўлоўскага да Янкі Запрудніка паўстае новы вобраз беларускага жыцьця ў Аргентыне. Чытачы могуць даведацца ня толькі пра вывучэньне беларусаведы ў Буэнас-Айрэсе, але й пра штодзённае жыцьцё тамтэйшых беларусаў, кошты, заробкі ды кантакты з радзімай.

Факсымільная публікацыя пратаколаў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва важная й як рэпрэзэнтацыя для дасьледчыкаў дакумэнтаў з гісторыі ўстановы, і як прадстаўленьне нязвыклых аўтографаў Натальлі Арсеньневай, што выконвала функцыі сакратаркі ў інстытуце.

У спэцыяльнай рубрыцы чытачы “Запісаў” упершыню змогуць прачытаць успаміны айца Льва Гарошкі, падрыхтаваныя да друку й грунтоўна пракамэнтаваныя гісторыкам Аляксандрам Пашкевічам. Гэты не завершаны аўтарам тэкст меў складаны шлях да публікацыі, які нарэшце можна лічыць пройдзеным. Пачынаў рыхтаваць успаміны Льва Гарошкі да друку іншы сьвятар – айцец Аляксандар Надсан з дапамогаю Аляксандра Аўдзеюка. Але праца так і не была скончаная, таму тэкст бачыць сьвет толькі цяпер.

А з асобаю Льва Гарошкі зьвязаныя й яшчэ некалькі публікацый гэтага нумару. Прыкладам, у “Архіваліях” зьмешчаныя лісты да яго літаратара Юркі Віцьбіча. У артыкуле Лявона Юрэвіча “Пісьменьнік Анатоль Жменя” айцец Леў разглядаецца як аўтар літаратурных твораў. А ў рубрыцы “Выданьне” Аляксандар Аўдзяюк распавядае пра заснаваны некалі айцом Гарошкам у Парыжы часапіс “Божым шляхам”. Поўная бібліяграфія гэтага часапіса таксама зьмешчаная на дыску ў дадатку да альманаху.

Рубрыка “Публікацыі” гэтым разам рэпрэзэнтуе тэксты, прысьвечаныя як канкрэтным асобам, гэтак і эміграцыйным структурам. Так, Макс Шчур на падставе вывучэньня архіўных дакумэнтаў распавядае пра Льва Клейнбарта, а Лявон Юрэвіч паказвае ў тэксьце “Audiatur et altera pars” розныя бакі й абставіны міжасабовага канфлікту біскупа Часлава Сіповіча ды грамадзкага дзеяча Язэпа Пазьняка. Юры й Мажэна Грыбоўскія прадстаўляюць чытачам матэрыялы пра спробы заснаваньня беларускага каталіцкага душпастырства ў лягерах Ды-Пі ў паваеннай Нямеччыне.

Іншы тэкст Юрыя Грыбоўскага, ужо ў рубрыцы “Архіваліі”, падае вынікі архіўных пошукаў на тэму беларускага руху ў міжваеннай Латвіі.

Адметнасьць новага нумару “Запісаў” яшчэ і ў тым, што тут прадстаўленыя адразу дзьве мэтрапольныя ўстановы, што афарміліся апошнім часам й займаюцца вывучэньнем беларускага замежжа. Тэма рэпрэзэнтаванага ўжо ў папярэднім нумары “Запісаў” стварэньня Цэнтру камплектаваньня й вывучэньня дакумэнтальнай спадчыны беларускага замежжа цяпер мае працяг у публікацыі матэрыялаў зь дзейнасьці гэтага цэнтру. У гэтым выпуску можна прачытаць гутарку старшыні навукова-творчай ініцыятывы Натальлі Гардзіенкі з дырэктаркай Беларускага дзяржаўнага архіву-музэю літаратуры й мастацтва наконт практыкі зьбіраньня й захаваньня архіваў эмігрантаў, а таксама ўбачыць апісаньне эміграцыйных фондаў, апрацаваных за апошні час. Другой установай, што спэцыялізуецца на “замежна-беларускай” праблематыцы стаў нядаўна афармлены Цэнтар дасьледаваньняў дыяспары ў Горадні. Пра ягоныя напрацоўкі й пляны распавядаюць Зьміцер Караў ды Настасься Дудзько.

Ва ўгодкавай рубрыцы “Запісаў” прадстаўленыя два юбіляры: 100-гадовы пісьменьнік Міхась Кавыль ды 50-га-

заканчэньне на бачыне 4

## Запісы БІНіМ № 38

***заканчэньне з бачыны 3***

довы сябра рэдкалегіі нашага альманаху Лявон Юрэвіч. Дапаўняе сьпіс пэрсаналій, пра якія ідзецца ў гэтым выпуску, спачылы ў 2015 г. айцец Аляксандар Надсан – пра яго як пра дасьледчыка распавядае Генадзь Сагановіч. У рубрыцы “In memoriam” зьмешчаны таксама водгук на нядаўні раптоўны адыход 50-гадовага мовазнаўцы Зьмітра Саўкі.

Традыцыйныя ўжо рубрыкі “Кніжная паліца” й “Хроніка” знаёмяць чытачоў з новымі кніжнымі выданьнямі, зьвязанымі з тэмай замежжа, ды некаторымі важнымі падзеямі ў эміграцыязнаўстве.

***Натальля ГАРДЗІЕНКА***

# Марш Паняволеных Народаў




У нядзелю, **17 ліпеня 2016 году,** адбудзецца Марш Паняволеных Народаў, што традыцыйна арганізуецца ў трэці тыдзень ліпеня Камітэтам Паняволеных Народаў у рамках афіцыйна абвешчанага яшчэ ў 1959 годзе Тыдня Паняволеных Народаў – імпрэзы, якая прыцягвае ўвагу амэрыканскага грамадзтва да стану народаў, што паняволеныя камуністычнымі, а таксама пост-камуністычнымі ды кожнымі іншымі тыраніямі й дыктатурамі.

Збор удзельнікаў Маршу ў нядзелю, **17 ліпеня**, а **9-й** гадзіне раніцы ля гатэля **“Plaza”** на ***59-й вуліцы*** і ***5-й авэню***. Адтуль удзельнікі рушаць да Катэдры сьв. Патрыка, дзе адбудзецца імша за Паняволеныя Народы, а потым пройдуць Маршам да ***72-й вуліцы ў Цэнтральным парку***, дзе адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё Тыдня Паняволеных Народаў.

Ад самага пачатку ў імпрэзах Тыдня бяруць удзел прадстаўнікі беларускай грамады Амэрыкі. Пасьля 1989-1991 гадоў большасьць этнічных арганізацыяў сябраў Камітэту Паняволеных Народаў, і ў тым ліку украінцы, адыйшла ад актыўнага ўдзелу, мяркуючы, што свабода ўжо здабытая, і ёй нішто не пагражае. Як бачым, гэтая “рэляксаваная” пазыцыя памылковая, і па дзьвух прычынах:

1. Свабода – гэта “штодзённы плебісцыт” (ніхто і нішто не згарантуе яе раз і назаўсёды).

2. Абавязак кожнага вызваленага народу – дапамагчы тым, хто застаецца паняволенымі. У кожным разе, запрашайце на гэтую імпрэзу вашых украінскіх, крымскататарскіх, расейскіх (не ачмураных пуцінскай прапагандай), зімбабвейскіх, віетнамскіх, кітайскіх, тыбецкіх, кубінскіх сяброў.

Пашырайце інфармацыю, паведамляйце сябрам і знаёмым!

Ліпеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”, у крыху скарочаным фармаце, адбудзецца адразу пасьля Маршу і адкрыцьця Тыдня Паняволеных Народаў паблізу **The Naumburg Bandshell** (знаходзіцца напоўдзень ад ***Bethesda Terrace*** паміж ***66-й*** і ***67-й вуліцамі***), прыкладна, а 2-й гадзіне папаўдні.

### Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

І. Галавашка ................60
К. Кузьменка ................60
М. Навіцкі ....................60
З. Сілко .......................60
Я. Траско .....................60
А. Фаменка ..................60

**Усім шчыры дзякуй!**

Шаноўныя сябры “Пагоні”, калі ласка, своечасова аплочвайце гадавыя складкі і падпіску на інфармацыйны бюлетэнь “Весткі й Паведамленьні”.

**Уплаты ў аддзел шліце на адрас:**
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*

**Чэкі выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня”** *Viktar Yedzinovich*.

## Наступны сход

### Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў нядзелю **17-га ліпеня 2016 года** на Мангэтане ў Цэнтральным парку пасьля заканчэньня Маршу Паняволеных Народаў і ўрачыстага адкрыцьця Тыдня Паняволеных Народаў. **(гл. абвестку вышэй)**

Сход пройдзе ў скарочаным фармаце.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных Згуртаваньнем “Пагоня”, можна даведацца, наведаўшы сайт* ***pahonia.com***

*Паважаная* ***Натальля Матыс,*** *калі ласка, паведаміце рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Буракоў ....................30
І. Галавашка .................30
Г. Дзімітрава .................30
В. Зайка ........................30
А. Копат ........................30
В. Кораб ........................30
М. Навіцкі .....................30
З. Сілко .........................30
А. Фаменка ...................30

**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь можна даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

***Marat Klakotski***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

*Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні”* ***Viktar Yedzinovich***.

*Падпіску таксама можна афарміць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку* ***www.e-krama.com***